Падтрымай "Вясну" на PATREON

Для слонімца, які заступіўся за дзяўчыну і парваў кашулю міліцыянту, пракурор запрасіў два гады "хатняй хіміі"

03.11.2020 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, сілавыя структуры



Пад час суду над Максімам Кучынскім. Фота: Газета Слонімская

У судзе Слонімскага раёна завяршаецца разгляд крымінальнай справы супраць мясцовага жыхара **Максіма Кучынскага**, якога вінавацяць у гвалтоўных дзеяннях супраць супрацоўніка міліцыі (арт. 364 КК РБ). Справу разглядае суддзя **Аляксандр Ярмолік**.

Максім Кучынскі быў затрыманы 9 жніўня ў Слоніме на мірнай акцыі пратэсту, калі заступіўся за дзяўчыну з бел-чырвона-белым сцягам, якую пры разгоне мітынгу збівалі сілавікі. Хлопец быў затрыманы, а на наступны дзень суд вынес пастанову аб адміністрацыйным арышце на 7 сутак.

Адначасова была ўзбуджаная крымінальная справа па арт 364 Крымінальнага кодэксу. Да суда, які пачаўся 2 лістапада, Кучынскі знаходзіўся пад падпіскай аб нявыездзе.

Як развіваліся падзеі

Адзін са сведак з боку абвінавачвання паказаў у судзе, што бачыў, як 9 жніўня Максім нібыта абхапіў "пацярпелага", супрацоўніка міліцыі **Максіма Герасімчыка**, і яны разам ўпалі долу. Пры гэтым Кучынскі нібыта прычыніў боль пацярпеламу, і нават надарваў яму кашулю.

Бок абароны сведчыць, што ў натоўпе абвінавачанага хтосьці ўдарыў і ён, падаючы, зачапіў супрацоўніка і тады яны разам зваліліся.

Астатнія сведкі самога моманту падзення пацярпелага і абвінавачанага не бачылі, а бачылі толькі наступствы, што яны абодва ляжалі на зямлі.

У пацярпелага Герасімчыка судова-медыцынская экспертызы цялесных пашкоджанняў не выявіла.



Пацярпелы Максім Герасімчык

“Заўтра зноў напэўна прыгоняць”

У першы дзень судовага паседжання 2 лістапада ў судовай залі прыкладна на 30 месцаў добрая палова была занятая супрацоўнікамі міліцыі ў форме і без.
Калі пасля абедзеннага перапынку грамадзяне вярнуліся на суд, судовая сакратарка сказала, што ідзе кварцаванне памяшкання і прасіла ўсіх пачакаць. За гэты час судовая зала дзіўным чынам ізноў напоўнілася супрацоўнікамі міліцыі, частка людзей у зале не змясцілася і яны вымушаныя былі сысці. Адзін з супрацоўнікаў міліцыі ўголас прамовіў свайму калегу: "Заўтра зноў напэўна прыгоняць".

Пракурор запрасіў два гады “хатняй хіміі”

Максім Кучынскі патлумачыў суду, што сваёй віны не прызнае цалкам, матэрыяльную шкоду (надрыў на форменнай кашулі) у памеры тры рублі кампенсаваў. Наконт пазову ў памеры 1000 рублёў, які пацярпелы просіць спагнаць на сваю карысць, а затым пералічыць на рахунак інфекцыйнага аддзялення Слонімскай ЦРБ, ён мае вялікія сумневы, што гэта робіцца без націску сверху.



Пракурор Віктар Русакевіч

На судовым паседжанні 3 лістапада выступіў дзяржабвінаваўца **Віктар Русакевіч**, які выказаў сваё меркаванне аб тым што віна Максіма Кучынскага цалкам даказаная матэрыяламі справы ў судзе і запрасіў для абвінавачанага **два гады абмежавання волі без накіравання ва ўстановы закрытага тыпу** ("хатняя хімія"). Таксама пракурор падтрымлівае матэрыяльны пазоў у памеры 1 000 рублёў

Прысуд па справе будзе абвешчаны ў 16 гадзін 4 лістапада.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 922 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ



Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць залежнікамі" – вясноўцы на акцыі ў Вільні

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

СЯБРОЎСТВА

EENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY